**Ганна САВІЧ, студэнтка 2 курса хіміка-тэхналагічнага факультэта Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэта харчавання.**



— Выбары прэзідэнта — сур'ёзнае палітычнае мерапрыемства, падзея, важная для кожнага грамадзяніна.

— Удзел у выбарах — мой грамадзянскі абавязак, спосаб выказаць сваю пазіцыю, прыняць удзел у кіраванні дзяржавай. Будучыня Радзімы мне не абыякава, таму я буду галасаваць. Наогул, моладзі асабліва неабходна прымаць удзел у выбарах. Будучыня залежыць ад нас, ад маладога пакалення. Калі мы хочам, каб яна была годнай, трэба зрабіць свой сур'ёзны і ўсвядомлены выбар.

— Я скончыла школу, стала студэнткай. Вельмі радуе, што для моладзі ў нас у краіне адкрыты ўсе дарогі. Дзяржаўная маладзёжная палітыка падтрымлівае ў пачынаннях любога маладога чалавека, дае вялікія магчымасці для самарэалізацыі, таму мае галоўныя дасягненні яшчэ наперадзе.

— Выбары 11 кастрычніка 2015 года будуць першымі выбарамі прэзідэнта ў маім жыцці. Аднак гэтае мерапрыемства для мяне не новае. У школе, якую я не так даўно скончыла, знаходзілася ўчастковая выбарчая камісія. Мы, школьнікі, былі там у якасці грамадскіх актывістаў. Праводзілі тлумачальную работу, выступалі з творчымі самадзейнымі нумарамі. Зараз я ўжо студэнтка, але па-ранейшаму прымаю актыўны ўдзел у грамадскім жыцці.

Вядома, галасаваць упершыню будзе хвалююча, але я ўжо даўно вызначылася з кандыдатам, за якога аддам свой голас. Я выбіраю стабільнасць, мір на беларускай зямлі, паспяховую і квітнеючую будучыню, таму галасаваць буду за дзеючага прэзідэнта А.Р.Лукашэнку.